**А. А. Жэлуновіч,** *загадчык кафедры рускай мовы як замежнай, кандыдат філалагічных навук, дацэнт,*
**В. В. Шунейка,** *старшы выкладчык кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры*

# ПРАБЛЕМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)» НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Падрыхтоўка кваліфікаваных спецыялістаў розных галін навукі прадугледжвае не толькі забеспячэнне навучэнцаў трывалымі прафесійнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, але і фарміраванне іх маўленчай кампетэнцыі. Паколькі мова і мысленне знаходзяцца ў непарыўнай сувязі, то ад узроўню моўнай адукацыі залежыць і якасць прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў розных сфер дзейнасці. Фарміраванне камунікатыўна развітой асобы, здольнай наладжваць кантакты на нацыянальнай мове, арыентавацца ў тэарэтычных і практычных праблемах функцыянавання беларускай спецыяльнай лексікі – адна з прыярытэтных задач вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

У сувязі з прыняццем новых Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (уступілі ў сілу з 1 верасня 2010 г.) узнікла тэрміновая неабходнасць стварэння новых вучэбна-метадычных матэрыялаў, накіраваных на актуалізацыю зменены правілаў. Паколькі змены закранулі адлюстраванне фанетычнага, марфалагічнага і сінтаксічнага бакоў моўнай практыкі, істотна абнавіліся падыходы выкладання і прэзентацыі моўнага матэрыялу ў вучэбнай аўдыторыі.

Выкладанне прадмета «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» падразумявае падрыхтоўку студэнтаў да рознага тыпу зносін у вуснай і пісьмовай формах, да далейшай работы з тэкстамі па спецыяльнасці, а таксама ўдасканаленне атрыманых уменняў і навыкаў. Навучанне беларускай мове ў ВНУ прадугледжвае фарміраванне камунікатыўнай кампетэнцыі, г. зн.:

1) уменне рэалізаваць маўленчы намер, які дазваляе ўстанавіць кантакт і паразуменне з іншымі людзьмі;

2) веданне структурных элементаў мовы (граматыка, словаўтварэнне), неабходных для камунікацыі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) уменне карыстацца структурнымі элементамі ў розных сітуацыях зносін.

Паспяховай рэалізацыі камунікатыўнага падыходу садзейнічае арганізацыя актыўнага маўленчага ўзаемадзеяння ў працэсе навучання. Арганізацыя актыўнага маўленчага ўзаемадзеяння дазваляе вырашаць наступныя задачы:

1) стварэнне матывацыі навучання і матывацыі зносін, набліжаных да рэальных;

2) засваенне максімальных аб'ёмаў вучэбнага матэрыялу ў мінімальны тэрмін;

3) гарманічнае з'яднанне аптымальных прыкладаў навучання з развіццём асобы ў працэсе навучання;

4) пераадоленне псіхалагічных бар'ераў;

5) лепшае практычнае засваенне мовы.

Спецыфіка навучання беларускай мове (прафесійнай лексіцы) на факультэце завочнага навучання мяркуе павышэнне ролі самастойнай работы пры комплексным падыходзе да методыкі выкладання: фанетыка, лексіка, граматыка вывучаюцца без падзелу на асобныя аспекты.

Практычны курс навучання беларускай мове на факультэце завочнага навучання грунтуецца на самай шырокай ініцыятыве выкладчыка ў выкарыстанні разнастайных і найбольш прадуктыўных метадычных прыёмаў і відаў работ з улікам апошніх дасягненняў айчынных і замежных спецыялістаў у галіне выкладання мовы.

З мэтай далейшага паглыблення ведаў студэнтаў, выпрацоўкі адпаведных уменняў і навыкаў самастойнага аналізу разнастайных моўных з'яў былі перапрацаваны тэставыя заданні для самакантролю па курсе «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» з улікам сучасных патрабаванняў, накіраваных на ліквідаванне разнабою ў пісьмовай беларускай мове і забеспячэнне функцыянавання адзінства яе правапісных норм у вусным і пісьмовым маўленні. Зборнік тэставых заданняў прызначаецца для студэнтаў дзённай і завочнай форм навучання БДУ культуры і мастацтваў пры падрыхтоўцы да заліку па курсе «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ў форме тэсціравання. Структура варыянтаў, змест і ўзровень цяжкасці тэставых заданняў адпавядаюць патрабаванням праграмы (Беларуская мова: прафесійная лексіка. – Мінск: БДУКМ, 2009. – 24 с.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўная мэта зборніка – замацаваць і ўдасканаліць веды па беларускай літаратурнай мове праз засваенне тэрміналагічнай лексікі па культуралагічных спецыяльнасцях, праз узбагачэнне слоўнікавага запасу будучых спецыялістаў і павышэнне культуры іх прафесійнага маўлення, а таксама актуалізаваць навыкі і ўменні эфектыўнага карыстання сродкамі беларускай мовы ў навуковай і практычнай дзейнасці.

Заданні тэстаў ахопліваюць асноўныя раздзелы курса беларускай мовы для студэнтаў усіх спецыяльнасцей факультэта завочнага навучання ўніверсітэта: фанетыку, арфаэпію, арфаграфію (заданні распрацаваны з улікам змен, унесеных новымі Правіламі беларускай арфаграфіі і пунктуацыі, марфалогію, лексікалогію, стылістыку – і накіраваны на выпрацоўку ўменняў і навыкаў практычнага валодання беларускай мовай і спецыяльнай тэрміналогіяй. Правапіс, адлюстроўваючы асаблівасці і заканамернасці беларускай мовы, з’яўляецца рэгламентуючым сродкам і, безумоўна, падлягае зменам.

Бесперапынныя развіццё і ўдасканаленне мовы за апошнія дзесяцігоддзі адбіліся і на абнаўленні лексічнага складу мовы. А паколькі пытанне нарматыўнасці маўлення з’яўляецца найбольш складаным для студэнтаў, у зборніку змешчаны «Акцэнталагічны слоўнік», увага ў ім засяроджана на словах, у якіх найбольш часта дапускаюцца адхіленні ад акцэнталагічных норм беларускай мовы і якія адлюстроўваюць асаблівасці функцыянавання новых правіл правапісу.

У дадзеным зборніку прапанаваны тры дэманстрацыйныя варыянты тэстаў, якія ўключаюць па 29 заданняў. У канцы дапаможніка змешчаны новыя правілы беларускага правапісу ў выглядзе табліц і табліца з указаннем нумара правільнага адказу (іх можа быць некалькі).

Практычны тэставы матэрыял зборніка і акцэнталагічны слоўнік дапамогуць студэнтам аднавіць і ўдакладніць неабходныя веды па пэўных раздзелах і тэмах курса, сістэматызаваць гэтыя веды з улікам новых Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

На сучасным этапе развіцця методыкі выкладання моў трывала замацаваўся прынцып кампетэнтнасна-арыентаванага навучання, які прадугледжвае: 1) веды, якія павінны быць засвоены; 2) уменні і навыкі, якія ў адпаведнасці з дзейнасным падыходам павінны быць сфарміраваны.

Па спецыфічных суадносінах ведаў і ўменняў прадмет «Беларуская мова» займае прамежкавае становішча паміж тэарэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычнымі і прыкладнымі дысцыплінамі прафесійнай падрыхтоўкі, таму што мова патрабуе таксама вялікага аб'ёму навыкаў і ўменняў – як практычныя дысцыпліны, але разам з тым і не меншага аб'ёму ведаў – як тэарэтычныя навукі. Гэта пэўным чынам адбіваецца на формах, метадах і сродках навучання, адбор якіх накіроўваецца на садзейнічанне рознабаковаму фарміраванню асобы студэнта, падрыхтоўцы яго да прафісійнай дзейнасці ў галіне культуры і мастацтва.

Тэставыя заданні як своеасаблівая форма прэзентацыі моўнага матэрыялу з'яўляюцца яшчэ і сродкам самаацэнкі ведаў з боку студэнта і неабходнай часткай сістэмы навучальных і кантрольных практыкаванняў, якія выкладчык мовы можа спалучаць у прафесійна-арыентаваным навучанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ